# 21 лютага Міжнародны Дзень Роднай мовы

# Чаму менавіта 21 лютага святкуецца Міжнародны дзень роднай мовы?

- У 1952 годзе ў Бангладэш (тагачасны ўсходні Пакістан) прымусова была ўведзена мова урду замест роднай мовы бангла. Гэта выклікала пратэсты насельніцтва і перш за ўсё студэнцкай моладзі.
- Падчас хваляванняў пяцёра студэнтаў былі застрэлены паліцыяй. У адказ актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух, які прывёў да аддзялення заходняга Пакістана і стварэння новай дзяржавы Бангладэш.
- Тыя пяць хлопцаў, што загінулі за сваю мову, сталі ў Бангладэш нацыянальнымі героямі і пакутнікамі
- З таго часу кожны год 21 лютага на плошчы збіраюцца тысячы людзей у знак павагі да тых, хто загінуў за родную мову. Цяпер мове бангла знікненне ўжо не пагражае

21 лютага

# ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

## Чаму я размаўляю на беларускай мове?

- Я люблю Беларусь і паважаю сваіх продкаў
- Родная мова - тое, што адрознівае нас ад іншых народаў
- Беларуская мова грунтуецца на лексічнай базе старабеларускай
- Старабеларуская мова ў XVI ст. - мова міждзяржаўнай перапіскі ва Усходняй Еўропе і афіцыйная мова ВКЛ да 1696 г.
- Беларускую мову лічаць адной з прыгажэйшых у Еўропе
- Старабеларускую мову выкарыстоўваў першадрукар Ф. Скарына
- Родная мова - гэта спадчына і карані народа. Адсячыце карані - дрэва загіне...

*Толькі самыя развітыя краіны ў XVI ст. мелі законы на ўласнай мове:*
*«не обчым якім языком, але сваім власным правасписаныя маем»*
*(Леў Сапега, XVI ст.)*



Міжнародны дзень роднай мовы адзначаюць 21 лютага ва ўсім свеце. Краіны Саюзнай дзяржавы не сталі выключэннем. У Беларусі і Расіі ў гэты дзень праходзяць цікавыя мерапрыемствы і акцыі.



***Кажуць, мова мая аджывае Век свой ціхі: ёй знікнуць пара. Для мяне ж яна вечна жывая,Як раса, як сляза, як зара.***
***П. Панчанка.***

- Сёння ў свеце шмат цудоўных моў. Адны з іх вабяць сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю, другія – мілагучнасцю. Але ў кожнага чалавека ёсць толькі адна родная мова, якая завецца роднай. Менавіта на гэтай мове ён размаўляе з роднымі, сябрамі, знаёмымі. І вельмі дрэнна, калі чалавек пачынае забывацца на сваю мову, не шануе яе.
- На працягу апошніх год  кожны народ 21 лютага адзначае Дзень роднай мовы. Першапачаткова з такой ініцыятывай выступіў Бангладэш. Менавіта ў гэтай краіне 21 лютага 1957 года загінулі пяць студэнтаў, якія адстойвалі права навучацца на роднай мове. Зараз у нашым рознакаляровым і рознагалосым свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моваў. Палова з іх пад пагрозай знікнення. Дзеля захавання моў, якія апынуліся на парозе знікнення, міжнародны фонд UNESCO абвясціў дзень роднай мовы — каб хоць у такі дзень на іх загаварылі, пра іх успомнілі.

# Гісторыя беларускай мовы

- Беларуская мова з'яўляецца старажытнапісьменнай, гісторыя беларускага пісьменства налічвае не менш за 10 стагоддзяў. Лічыцца, што пісьменнасць прыйшла на беларускія землі разам з хрысціянствам у канцы X стагоддзя.
- Умоўна пачатак зараджэння асобнай беларускай мовы адносяць да канца 13 — пачатку 14 стагоддзя. Менавіта ў гэты час у граматах, дзелавой і асабістай перапісцы пачынаюць спарадычна адлюстроўвацца моўныя з'явы, якія пазней сталі характэрнымі для беларускай мовы. Мова беларускага народа склалася ў XIV—XVI стагоддзях, калі землі сучаснай Беларусі ўваходзілі ў склад ВКЛ.

***Беларусы, якія не наважваюцца перайсці на беларускую мову, часцей за ўсё маюць 1001 прычыну для гэтага. Вось некаторыя з іх:***

- *Я кепска размаўляю па-беларуску, таму лепш не псаваць сваімі памылкамі гэтую цудоўную мову* . – Ніводная нацыя ў свеце не размаўляе на літаратурнай мове! Нават беларускія пісьменнікі кожны мае “свой варыянт” мовы, з дамешкамі і рэгіянальнымі асаблівасцямі.
- *Я з дзяцінства размаўляю па-расейску, мая сям’я расейскамоўная* . – Уявіце, што з такімі перакананнямі вам давялося б пераехаць жыць у Францыю ці Амерыку. Таксама б працягвалі?..
- *Гэта мёртвая мова, ніхто ў горадзе на ёй не гаворыць* . – То маеце шанец стаць першым! І прыкладам для іншых гараджанаў – калі яны не пачнуць тут жа размаўляць, то прынамсі задумаюцца.
- *Гэта мова калхозу і апазіцыі.* – Вы адсталі ад трэнду! Сёння беларуская мова – мова культуры, інтэлігенцыі, а таксама мова для кожнага беларуса на ўсе выпадкі жыцця

# Папаўняйце свой слоўнікавы запас

- Пачніце з пасіўных спосабаў: чытайце кнігі, глядзіце агучаныя па-беларуску фільмы, слухайце беларускамоўную музыку, чытайце беларускамоўныя сайты і газеты, усталюйце на кампутары праграмы з беларускім інтэрфейсам. На сайтах, дзе гэта дасяжна, пераключайцеся на беларускую мову. Тое самае – з банкаматамі, інфакіёскамі і г.д.



# Пішыце па-беларуску

- Калі вам складана пачаць размаўляць – пачніце з пісьмовай мовы. Мэйлы, эсэмэскі, паведамленні ў інтэрнэце, допісы ў сацсетках. Пры гэтым вы маеце час абдумаць напісанае, зазірнуць у слоўнік (slounik.org). Вашыя знаёмыя пачнуць звыкацца да вас-беларускамоўнага, а вы знойдзеце новых беларускамоўных знаёмых.

# Пазнаёмцеся з дасведчанымі носьбітамі мовы

- Патлумачце ім, што толькі вучыцеся. Папрасіце выпраўляць памылкі ў вашым маўленні і лексіцы. Уважліва слухайце, як гаворыць дасведчаны чалавек. Прасіце яго тлумачыць незразумелыя словы.
- Для таго, каб пачаць не толькі размаўляць, але і думаць, сніць сны па-беларуску, вам спатрэбіцца час. Але мэта таго вартая, бо разам з моваю вам адкрыецца ўнікальны беларускі сусвет!

# СМАК


БУЛЬБА З ГРЫБАМІ
ГРЫБЫ 500г
АБДАЦЬ КІПНЕМ,
ВЫПАРЫЦЬ ВАДУ НА ПАТЭЛЬНІ
БУЛЬБА 350г
ЦЫБУЛЯ 100г
СМАЖЫЦЬ УСЁ РАЗАМ ДА ГАТОЎНАСЦІ,
НАПРЫКАНЦЫ ЗАПРАВІЦЬ СМЯТАНАЙ,
ПАСЫПАЦЬ ЗЕЛЯНІНАЙ
ТОПЛЕНАЕ МАСЛА
СОЛЬ
etno.by
ПРОСТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЕЖА


ВЕРАШЧАКА
1) СЯЛЯНСКУЮ КАЎБАСУ, 300г
СВІНЫЯ РАБРЫНКІ, 300г
СОЛЬ
ВАРЫЦЬ 40хв.
2) ПАРЭЗАЦЬ КАЎБАСУ, АБСМАЖЫЦЬ РАЗАМ З РАБРЫНАЙ
3) ПАДКАЛОТА: МУКУ РАЗБАВІЦЬ АПАЛОНІКАМ ЮШКІ, ЗАТЫМ УЛІЦЬ РЭШТУ ВАДКАСЦІ
НА 1л ЮШКІ 2–3 ст.л. МУКІ
4) У РОНДЛІ ЗЛУЧЫЦЬ ПАДКАЛОТУ З КАЎБАСОЙ І РЭБРАМІ,
ДАДАЦЬ ЛАЎРОВЫ ЛІСТ, ПЕРАЦ, ПАТУШЫЦЬ І НАСТАЯЦЬ. ПАДАВАЦЬ З БЛІНАМІ, БУЛЬБАЙ, ХЛЕБАМ
etno.by
ПРОСТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЕЖА


БАБКА
1) ЗАШКВАРЫЦЬ САЛА 150г
ПАДСМАЖЫЦЬ НА ІМ 2 ЦЫБУЛІНЫ
2) БУЛЬБУ 0,5кг
НАДРАЦЬ НА ТАРЦЫ
3) УСЁ ЗМЯШАЦЬ, ДАДАЦЬ МУКУ, СОЛЬ, ПЕРАЦ, ЯЙКА
1 СТ.Л.
4) ЗВЕРХУ ПАКЛАСЦІ КАВАЛАЧКІ МАСЛА
ЗАПЯЧЫ
45хв. 190°C
ПАДАВАЦЬ ГАРАЧАЙ СА СМЯТАНАЙ
etno.by
ПРОСТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЕЖА

# СМАК



КЛЁЦКІ
БУЛЬБУ (0,8 кг)
ДРОБНА НАДЗЕРЦІ,
СОК АДЦІСНУЦЬ, АДСТАЯЦЬ І ЗЛІЦЬ
КРУХМАЛ, ЯКІ АСЕЎ, ЗМЯШАЦЬ З БУЛЬБАЙ,
ДАДАЦЬ ЯЙКА,
2 ст.л. МУКІ
Ø2см
СКАТАЦЬ КЛЁЦКІ,
ВАРЫЦЬ ЧАСТКАМІ Ў САЛЁНАЙ ВАДЗЕ
10 хвілін
АБСМАЖЫЦЬ НА ТОПЛЕНЫМ МАСЛЕ З КМЕНАМ
ПРОСТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЕЖА




ХАЛАДНІК
БУРАКІ
350г
2 ЯЙКІ
СЫРАКВАША
0,5л
ВАДА 0,5л
АГУРКІ
200г
КРОП
40г
ЦЫБУЛЯ
100г
СОЛЬ
УСЁ ЗМЯШАЦЬ, АСТУДЗІЦЬ, ПАДАВАЦЬ
СА СМЯТАНАЙ, ПЕЧАНАЙ БУЛЬБАЙ
ПРОСТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЕЖА




ТОЎСТЫЯ БЛІНЫ
СЫРОВАТКУ
40°С
1,2 л
НАГРЭЦЬ, ДАДАЦЬ
СОДЫ
1 лыжачку
МУКІ
3-4 шклянкі
АЛЕЮ
3 лыжкі
СОЛЬ
ЦЕСТА ВЫТРЫМАЦЬ
У ЦЯПЛЕ ПАЎГАДЗІНЫ
ПЯЧЫ ПАД ВЕЧКАМ
ЕСЦІ З МАЧАНКАЙ, ВАРЭННЕМ, СМЯТАНАЮ, ЯК ХЛЕБ
ПРОСТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЕЖА

# Будзьце ветлівымі



Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Празь цемру і горы змаганьняў суровых.
Калі ж ападзе і разьвеецца дым
І нівываскросшыя закаласяцца, –
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазьвініш ты у кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сярэбраны гром
І вусны расквеціш усьмешкай дзіцяці.


Я - беларус,
мая родная мова - беларуская.
Васіль Быкаў